**КЛЯСКУ́Н** (ад кляскаць, біць у далоні, падскокваць, шчоўкаць языком з радасці), бажаство месяца і летніх забаў і задавальненняў, падобнае на Бахуса. Беларусы ўяўлялі яго маладым, прыгожым, статным, незвычайнай велічыні, з доўгімі светлымі валасамі. Разгульны К. мае месяц у лобе, што тлумачылі яго колішнім жыццём на небе, дзе ён распараджаўся, як у сябе дома. Пад яго падначаленнем быў месяц, які ён, калі трэба было, паказваў людзям, хаваў, асвятляў і раз'язджаў у ім па небе. К. заўсёды павінен быў знаходзіцца пры ім неадступна і глядзець сваімі яснымі вачыма прама на яго. У выпадку адлучкі па волі Перуна месяц цямнеў, паколькі пры ім не было светлага твару К. Аднойчы К. адлучыўся без дазволу Перуна і, затрымаўшыся недзе на балі ў інш. божастваў, доўга не вяртаўся. Пярун разгневаўся і сапхнуў яго з неба на зямлю, але на памяць, што ён кіраваў месяцам і захоўваў яго, адбіў на яго лобе месячык, а на месца К. прыставіў іншага. У гонар К. ў маі ці ў чэрвені на Беларусі праводзілі абрад. Калі ўзыдзе месяц, дзяўчаты і хлопцы выбіралі ў сваім карагодзе стройнага дзецюка на ролю К. і, прыбраўшы яго рознымі кветкамі, наклеіўшы яму на лоб з пялёсткаў штосьці накшталт месяца, прыводзілі ў лес на паляну, дзе разыгрывалі дзейства, спявалі песні ў гонар К. Прыносілі яму ахвяры, К. распальваў рытуальнае вогнішча і дзяліў між усімі прысутнымі прынесеныя дары. Быў вядомы ў Віцебскай і Мінскай губернях. Згадваўся ў нар. выразах: «Раскляскаўся, як Кляскун той», «Не кляскуй, Кляскун, бо нямашака яшчэ месячка».

*Літ.*: Древлянский П. [Шпилевский П.]. Белорусские народные поверья // Журн. М-ва нар. просвещения. 1852. Лит. прибавление №3.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ